***Віёла Казаніна***

**ШВЕЙНЫЯ МАШЫНЫ КАМПАНІІ «ЗІНГЕР» У МАСТАЦКАЙ ВЫШЫЎЦЫ ТРАДЫЦЫЙНАГА ТЭКСТЫЛЮ**

*У артыкуле разглядаецца тое, што прадуктыўнасць швейных машын кампаніі «Зінгер», як і эстэтычная каштоўнасць прадметаў, атрыманых з яе дапамогай, да гэтага часу застаюцца бясспрэчнымі. Яны ў стане прашыць усё: ад самай тонкай тканіны да грубага сукна; супраць удару іх усёпранікальнай іголкі не можа выстаяць нават скура. А хупавыя вырабы, выкананыя пры дапамозе швейнай машыны кампаніі «Зінгер», дзіваць сваёй мастацкасцю.*

***Viola Kazanina***

**SEWING MACHINES OF SINGER COMPANY IN EMBROIDERY ART OF TRADITIONAL TEXTILES**

*The article analyzes the fact that the capability of the Singer sewing machines, as well as the aesthetic value of the artifacts which were made by them, remain indisputable so far. They are able to sew everything: from the finest tissue to the thickest fabric; even skin cannot resist to the all-pervading needle. And the gorgeous artifacts, produced with the help of the Singer sewing machine, impress us with their artistry.*

*«Синяя синичка весь бѣлый свѣтъ одѣла»*
*(Русская народная загадка)* [1, с. 700].

Нібы пазіраючы ў акно свяцёлкі скрозь стагоддзі, мы можам сузіраць, што швейная машына мае сваю «паэзію» і сваю «прозу». *Паэзію* яе складаюць працы, прысвечаныя мастацтву: пышна вытканыя карціны, партрэты, ландшафты, выявы кветак, садавіны, жывёл, якія прадстаўляюць «копіі ў фарбах» з карцін лепшых майстроў. *Проза* швейнай машыны – вырабляемыя на ёй разнастайныя працы для практычных мэтаў: вышыўкі для сукенак і бялізны, коўдраў, падушак, фіранак і штор, узоры нацыянальных касцюмаў і т. п (мал. 1, 2, 3).







Малюнак 1, 2 – Мардоўскі нацыянальны касцюм (пачатак XX ст.): выдатны як вышыўкай крыжыкамі, так і радком па цюлю (фатаграфіі са збору аўтара)

Малюнак 3 – Габрэйскі нацыянальны касцюм, пачатак XX ст. (фатаграфія са збору аўтара)

Сотні гадоў, стагоддзе за стагоддзямі, ва ўсіх краінах свету, у шумных гарадах і ў мірнай, цудатворнай цішы сёлаў і вёсак бавіла за шыццём доўгія зімовыя вечары і белыя летнія ночы цярплівая працаўніца. Але светлы прамень чалавечага генія, які ўсё больш палягчае сваімі вынаходствамі барацьбу за існаванне, зазірнуў і ў гэтую вобласць працы, – і на змену іголцы вынайшаў сталёвыя мускулы машыны, якая не ведае ні стомы, ні часу.

Неймаверна велізарная заслуга першага вынаходніка швейнай машыны, але яшчэ больш значная была праца тых, хто яе ўдасканаліў. Паўстагоддзя выдасканалена працавалі лепшыя тэхнікі і механікі, і ў гэтых адносінах ільвіная доля працы і намаганняў выпала кампаніі «Зінгер».

На наладжанай у снежні 1904 года кампаніяй «Зінгер» у Пецярбургу дабрачыннай выставе можна было ўбачыць дзіўныя па сваёй мастацкай рабоце вышыўкі, усе без выключэння выкананыя на звычайнай, хатняй швейнай машыне кампаніі «Зінгер». Перад вачыма наведвальнікаў красаваліся карціны з Дрэздэнскай галерэі, Луўра, Эрмітажа і іншых мастацкіх музеяў-галерэй, і ўсё гэта было жывапісам іголкі, стварэннем тэхнікі мастацкіх рукадзелляў.

Усё вялікае проста. Тэхніка мастацкай вышыўкі на машыне кампаніі «Зінгер» немудрагелістая. Для стварэння разнастайных маляўнічых эфектаў, захавання перспектывы і рэльефнасці малюнка, спачатку ўжывалася тры роды шыцця. Першы – шыццё роўняддзю – вядомы быў кожнай хоць трохі майстэрскай рукадзельніцы. Але, імкнучыся ўдасканаліць працы швейных машын не толькі тэхнічна, але і з мастацкага боку, кампанія «Зінгер» вынайшла новы спосаб – вузлаватае шыццё. Шыццё гэта ўяўляе вельмі тонкую сцёжку, якую можна размяшчаць у колькі заўгодна слаёў адзін над іншым; дзякуючы гэтаму дасягаліся найтонкія пераходы фарбаў і пяшчотныя спалучэнні тонаў, якія выраблюць, у злучэнні з бляскам шоўку, дзіўна своеасаблівыя эфекты. Трэці вынайдзены род шыцця – плюшавае шыццё: у ім узор выступаў з матэрыі так рэльефна, быццам ён быў вышыты аксамітнымі або плюшавымі ніткамі. Дасягалася гэта рэльефнасць шляхам прысцёгвання да правага боку матэрыі тоўстай падшыўкі ў той час, калі ўзор вышываўся на левым баку.

Але гэтым не вычэрпваюцца мастацкія сілы звычайнай швейнай машыны. Кампанія «Зінгер» на вышэйзгаданай выставе сваіх работ паказала, якія мастацкія шэдэўры можна было стварыць на яе звычайнай у тыя часы, хатняй швейнай машыне. Усе цудоўныя ажурныя вышыўкі і разнастайнейшыя скразныя, вытанчаныя працы, найкаштоўнейшыя карункі, раскошныя суцэльныя дываны, дарожкі, манаграмы і літары і. т. п. – усё гэта такія ўзоры мастацтва, якія павінны былі абвергнуць стварыўшуюся на працягу стагоддзяў перавагу і высокую каштоўнасць «ручной працы»... Пры гэтым, несумненна, адбівалася вядомая суб'ектыўнасць у працы, якая вымярае сабою мастацкі ўзровень выканання, у справе выбару фарбаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спалучэнняў тонаў. Такім чынам, гэта не была бяздушная механічная праца, а ідэальнае злучэнне суб'ектыўнай творчасці з рэгулярнасцю машыны.

Для швейнай машыны кампаніі «Зінгер» было месца ў кожным доме, у кожнай сям'і, у прыватнасці, менавіта дзякуючы ёй да нас дайшла вялікая колькасць аўтэнтычных вышывак і адзення з мінулага, якое таксама да гэтага часу сустракаецца намі і на старых фотаздымках (мал. 4, 5, 6).



Малюнак 4 – Украінскі нацыянальны касцюм, пачатак XX ст. (фатаграфія са збору аўтара)



Малюнак 5 – Беларускі нацыянальны касцюм, пачатак XX ст. (фатаграфія са збору аўтара)



Малюнак 6 – Рускі нацыянальны касцюм, 1885 год (фатаграфія са збору аўтара)

Усё гэта дасягалася на машыне ў чатыры разы хутчэй, чым рукой нават самай майстэрскай і дасведчанай працаўніцы. А якая перавага была ў чысціні і дакладнасці працы! Якім бы далікатным і тонкім ні быў матэрыял, машынная вышыўка не давала ні крывізны, ні сцягвання ў бок. Адным словам, атрымліваўся ідэал вышыўкі, – як тэхнічны, гэтак і мастацкі. Нават цяперашні час не з'яўляецца таму выключэннем.

Для працаўніц-прафесіяналак і ўвогуле для менш заможных людзей кампанія «Зінгер» у тыя часы зрабіла вялікую палёгку пры набыцці ў яе швейных машын (мал. 7). Дапушчалася таксама і растэрміноўка платы – умовы былі даступныя кожнаму. Ва ўсіх тагачасных шматлікіх крамах і аддзяленнях кампаніі «Зінгер», раскіданых па ўсёй Расіі, выраблялася пры куплі бясплатнае навучанне шыццю на машыне. Апроч гэтага ў розных краінах выдаваліся адмысловыя сертыфікаты, якія сведчылі пра сканчэнне курсаў (мал. 8).

Цэнтр усіх гэтых незлічоных аддзяленняў кампаніі «Зінгер» быў уладкаваны ў Санкт-Пецярбургу – сталіцы Расійскай Імперыі да 1918 года. Велічэзны адрэстаўраваны сяміпавярховы будынак, цалкам пабудаваны з граніту, на дадзены момант з'яўляецца галоўным офісам «УКантакце», на Неўскім праспекце, каля Казанскага маста, каранаваны адноўленым купалам з алегарычнымі фігурамі, што трымаюць зямны шар, некалі падпеоразаны кампаніяй «Зінгер», які паказваў увачавідкі, якіх фенаменальных памераў дасягнула чыннасць гэтай фірмы. Уяўляючы сабою дзіва архітэктурнага мастацтва, гэты будынак і дагэтуль з'яўляецца ўпрыгожаннем былой сталіцы і яе галоўнай артэрыі – Неўскага праспекта (мал. 9).



Малюнак 7 – Паштоўка кампаніі «Зінгер», пачатак XX ст. (фатаграфія са збору аўтара)




Малюнак 8 – Сертыфікат аб заканчэнні курсаў ад кампаніі «Зінгер», Варшава, 1938 год (са збору аўтара)



Малюнак 9 – Будынак кампаніі «Зінгер», 1905 год [1, с. 700]




Малюнак 10 – Рэклама кампаніі «Зінгер», 1906 год [2]

На ўсіх выставах у крамах кампаніі, лік якіх у Расіі перавышаў 1200, красавалася вядомае гандлёвае таўро: аточаная літарай «З» славянская красуня ў нацыянальным сарафане і какошніку, за швейнай машынай – сімвалізавала імкненні кампаніі «Зінгер» (мал. 10). Гэта было ўвасабленне самай Расіі за швейнай машынай, дзе тысячы швейных машын Зінгера сваімі сталёвымі мускуламі дапамагалі людзям шыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**
1. Нива : иллюстрированный журнал литературы, политики и современной жизни / ред. Р. Сементковский. — Санкт-Петербург : Издательство А. Маркса, 1869-1918 ( : Тип. А. Маркса). – 1905. – № 35. – С. 700–700б.
2. Реклама компании Зингер, 1906 // Wikimedia.org [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:%D0%A0%D0%B5%D0%BA%D0%BB%D0%B0%D0%BC%D0%B0_%D0%BA%D0%BE%D0%BC%D0%BF%D0%B0%D0%BD%D0%B8%D0%B8_%D0%97%D0%B8%D0%BD%D0%B3%D0%B5%D1%80,_1906.jpg. – Дата доступу: 18.03.2019.

***Надзея Касцяневіч***

**ЭЛЕМЕНТЫ НАРОДНАГА ТАНЦА ДЛЯ ВЫКЛАДАННЯ Ў ДЗІЦЯЧЫМ КАЛЕКТЫВЕ *(на прыкладзе фальклорнага калектыва «Мілавіца»)***

*Асаблівасць беларускага народна-побытавага танца з аднаго боку ў яго стрыманасці, з другога – у разняволеннасці, «прыземістаці» і сваім трохкрокавым руху з акцэнтам на першую долю. Глыбінная беларуская спецыфіка танцаў адбілася найбольш выразна ў карагоднай традыцыі і абрадах.*

**Nadzeya Kascyanievich**

**ELEMENTS OF A POPULAR DANCE DISPLAYED IN CHILDREN GROUP *(on the occasion of the folklore of the «Milavitsa» group)***

*The peculiarity of the Belarusian people's everyday dance with one hand in his restraint, on the other - in relaxed, squat three-step movement with an emphasis on the first beat. Deep Belarusian specifics dance affected most clearly in the round dance traditions and rituals.*

Народны танец – адзін са старажытных відаў народнай творчасці. Калі разглядаць аўтэнтычны танец, то гэта адна з складаных сістэм, якая спалучае абрадавыя і пазаабрадавыя функцыі (вечарыны, ігрышчы, забавы і інш.).

Такі від мастацва, як танец, як піша Алексютовіч Л.К., можа раскрываць шматвектарнаць адлюстравання ўсяго навокал. Напрыклад, танцы, якія раскрываюць характар народа («Лявоніха», «Крыжачок»), адлюстроўваюць працоўныя працэсы («Таўкачыкі»), распавядаюць пра з'явы прыроды («Мяцеліца»), паказваюць жартоўны сюжэт ў характары чалавека («Юрачка», «Мікіта»), пераймаюць рухі жывёл, птушак («Козачка», «Журавель»); карагоды гульнявые і танцавальныя («Проса», «А на гары мак»), а таксама абрадавыя і пацешныя гульні («Жаніцьба Цярэшкі», «У сляпца» і інш.).

Разнастайнасць формаў беларускага харэаграфічнага мастацва выклікае неабходнасць класіфікаваць яго па танцавальным жанрам, якія, ў сваю чаргу, аб'ядноўваюць танцы розныя па форме і зместу. Алексютовіч вылучае танцы і скокі, кадрылі, карагоды, гульні [1].

Адметнай рысай культуры беларускага народнага танца з'яўляецца наяўнасць устойлівых рухаў, якія падкрэсліваюць гістарычнае паходжанне старажытных форм разнавіднасцей танцавальных малюнкаў. Беларускім народным танцам характэрна «прыземістасць» (нязначныя скокі ў гару), дынамічнасць, стрыманасць і калектыўны характар рухаў. Галоўным, базавым рухам беларусаў лічыцца трохкрок (трайны прытоп), які складае большую палову танцаў («Лявоніха», «Вальс», «Матылёк» і інш.).

Як піша Мікола Козенка, «глыбінная беларуская спецыфіка танцаў адбілася найбольш выразна ў карагоднай традыцыі і абрадах» [5].

Па сістэмнай класіфікацыі М.Козенкі, можна раскласці танец на пэўныя стылі, жанры, гістарычна-стылявыя пласты і выканаўцаў. Па-першае, у фарміраванні стыля трэба прытрымліваца кампазіцыі, структуры і лексікі, дзе ўсё пералічанае звязвае паміж сабой характар танца. Можна прасачыць, што ў кожнага танца есць свой асабісты, адметны стыль, які трэба перадаць, каб яго пазналі. Па-другое, каб выкладаць элементы народнага танца, трэба вызначыць танцораў (выканаўцаў), дзе будзе ўлічвацца ўзрост, склад і гендарнае дзяленне навучэнцаў. Па-трэцяе, вызначыцца з жанрам танца: ілюстрацыйна-выяўленчым, танцавальна-гульнявым, імправізацыйным, арнаметальным, зыходзячы ад простага да складанага. Па-чацвёртае, каб займацца вывучэннем беларускага танца, трэба ведаць гісторыка-стылявыя пласты, перыяды фарміравання танцаў. Акрамя гэтага, разумець функцыянальнае значэнне танца (абрадавае, пазаабрадавае, прымеркаваныя да пэўнага часу ці абставін).

У працэсе навучання танцам С.Г. Выскварка вылучыў правіла трох «П»: пабачыў, пачуў, паўтарыў. Гэтая трохчастнасць вывучэння добра раскладае дзеянні пры выкладанні народнага танца. Выбудоўваецца гэта так: спачатку трэба паказаць той ці іншы танец (матэрыял), пасля пераходзім да падрабязнага тлумачэння кожнага элемента, а трэцяя складаючая правіла трох «П» – праца над паўтарэннем гэтым рухаў [3].

Калі казаць пра дзіцячы фальклорны калектыў «Мілавіца», трэба адзначыць, што яго дзейнасць пачалася з 1990 года, а заснавальнікам з'яўляецца педагог ад Бога Марыя Васільеўна Снітко, якая з усёй сваей самаадданнасцю сфарміравала фальклорны рух у прасторах горада Мінска. Накірункі дзейнасці калектыва ахопліваюць амаль увесь пласт фальклора, ад народнай песні да побытавага танца, рэпертуар якога складаўся з уласных экспедыцыйных матэрыялаў Марыі Снітко. У калектыве адчуваецца суцэльная ўзаемасувязь паміж усімі відамі фальклору. Песня і танец былі непасрэдна звязаны з жыццём беларускага народа, яго дзейнасцю ў пэўны перыяд існавання. Гэтыя віды мастацва распавядаюць пра гісторыю існавання беларусаў.

Выкладанне фальклору, а менавіта народнага танца, уласцівага беларусам, справа ня лёгкая, але калі есць пэўная сістэма, складанасці лёгка вырашаюцца. Фальклорны калектыў «Мілавіца» выбудаваў сваю ўласную паслядоўнасць вывучэння беларускага фальклору, у кантэксце якой вывучаюцца элементы народнага танца. Праца вядзецца па каляндарнаму колу, ад Калядаў да Піліпаўкі, навучанне ідзе паступова, ад простага да складанага.

На першам годзе навучання дзецям выкладаюцца простыя танцавальныя рухі праз фальклорныя папевачкі ды гульні, такія як «Вясёлы бубен» ды інш. На другім годзе – дзеці больш падрабязна дакранаюцца да танцавальнага мастацтва, вядзецца праца над простымі танцавальна-гульнявымі карагодамі, такімі як «А баяры, а мы к вам прыйшлі». На трэцім годзе – вывучаюць танцы ў простым бытаванні: «Мальвіна», «Кракавяк» і інш.

Першапачаткова калектыў Мілавіца вывучаў народныя танцы без метадычных парадаў, проста з нагі на нагу, як танцавалі ў вёсцы Грыцкавічы, Крупскага раёна, тое, што засвоіла кіраўніца гурта ад сваіх аднавяскоўцаў ў дзяцінстве.

Аднак паступова ў калектыве пачала фармавацца свая методыка выкладання. З'явілася праца па развіццю рытмічнасці шляхам пляскання ў далоні, вылучаючы моцную долю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ